# Выстаўкі, прысвечаныя жыццю і дзейнасці паэта

Вялікая літаратурная выстаўка, прысвечаная А. Міцкевічу, адкрылася ў Беларускай дзяржаўнай бібліятэцы імені Леніна ў Мінску. На выстаўцы прадстаўлены творы паэта на польскай, рускай, беларускай, украінскай і іншых мовах. Тут ёсць першы і другі томы выбраных твораў паэта на французскай мове, пераклад Я. Купалы верша Міцкевіча «Мужык і вужака», бяссмертная паэма «Пан Тадэуш» і многа іншых твораў.

Адкрытае пасяджэнне кафедры літаратуры, прысвечанае памяці Адама Міцкевіча, адбудзецца ў мінскім педагагічным інстытуце імені Горкага. Калектыў інстытута праслухае даклад аднаго з польскіх пісьменнікаў аб творчым шляху Міцкевіча. У гэтым-жа інстытуце рыхтуецца літаратурная выстаўка.

Ілюстрыраваная выстаўка аб жыцці і літаратурнай дзейнасці Міцкевіча і яго дружбе з вялікім рускім паэтам А. С. Пушкіным наладжваецца ў Навагрудскім гарадскім музеі. Выстаўка будзе мець раздзелы—«Міцкевіч у Навагрудку», «Міцкевіч у Віленскім універсітэце», «Міцкевіч настаўнікам у Каунасе», «Творчасць Міцкевіча», «Навуковая літаратура аб юнацкім перыядзе творчасці паэта», «Міцкевіч—палітзняволеным ў Вільне», «Палітычная дзейнасць Міцкевіча», «Бібліятэка Міцкевіча і яго сям'і» і «Савецкі друк аб Міцкевічу». Для гэтай выстаўкі мастак т. Альтман зрабіў партрэт Адама Міцкевіча, партрэт Пушкіна, кампазіцыю «Пушкін і Міцкевіч ля помніка Пятра Вялікага» і інш.